**У. Ц. Піскун** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# КОЛАСАЎСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ ВУЧНЯЎ ЯК ДЫДАКТЫЧНАЯ АСНОВА СУЧАСНАЙ ЛІНГВАМЕТОДЫКІ

Адна з найбольш актуальных праблем сучаснай методыкі беларускай мовы – развіццё маўлення вучняў. З гэтага пункту гледжання асабліва карыснай для настаўнікаў з'яўляецца "Методыка роднае мовы" К. М. Міцкевіча (Я. Коласа). Яна змяшчае ў сабе стройна распрацаваную канцэпцыю развіцця мовы вучняў, якая апрабавана аўтарам на практыцы.

У прадмове да "Методыкі роднае мовы" Я. Колас адзначаў, што ён не прэтэндуе на самабытнасць, арыгінальнасць кнігі. Аднак у ёй, што асабліва важна для нас зараз, ён дае настаўніку тое, што "канечна, патрэбна з педагагічнага і метадычнага пагляду для правільнай работы ў школе" [1, с. 315]. Акрамя таго, вялікі педагог і метадыст выказвае тут многа цікавых ідэй, добрых практычных парад, далучэнне да якіх настаўніка раскрывае перспектывы прафесійнага росту.

Методыка, лічыць Колас-педагог, павінна найперш вызначаць задачы навучання роднай мове, выяўляць, якія метады і прыёмы адпавядаюць педагагічным прынцыпам, і даваць практычныя спосабы самога працэсу навучання [2, с. 144].

Як і К. Дз. Ушынскі, Я. Колас надаваў вялікае значэнне роднай мове ў сістэме навучання дзяцей. Сярод іншых прадметаў месца роднай мовы,

МГПУ им. И.П. Шамякина

паводле Я. Коласа, вызначаецца яе агульнаасветным, выхаваўчым і практычным значэннямі ў сістэме навучання. Акрэсліваючы агульнаасветнае значэнне мовы, ён указвае на цесную сувязь мовы з маўленнем, з пазнавальнай дзейнасцю вучняў.

Важным пытаннем методыкі роднай мовы з'яўляецца вызначэнне задач навучання, якія Я. Колас фармулюе наступным чынам: а) навучыць дзяцей чытаць; б) навучыць дзяцей пісаць; в) "давесці да разумення самога ладу мовы"; г) развіваць іх вусную мову.

Кожная з названых задач рэалізуецца праз вырашэнне яе аспектаў. У прыватнасці, навучанне дзяцей чытанню – гэта перш за ўсё навучанне механізму чытання, азнаямленне з літарамі і навучанне па гуках-літарах складаць словы, са слоў – сказы. Чытанне – крыніца развіцця мовы дзяцей. У сувязі з гэтым Я. Колас раіць чытаць як мага болей добрых кніг, бо яны выпрацоўваюць літаратурны густ, служаць эстэтычнаму выхаванню дзяцей. Чытанне ўзбагачае фантазію вучняў, дае "новыя разнастайныя перажыванні, выхоўвае ў іх густ да прыгожага, да паэзіі і мастацтва" [1, с. 396].

Фарміраванне свядомага чытача пачынаецца з першых дзён дзіцяці ў школе. Першапачатковыя навыкі чытання, уменне правільна разумець і ацэньваць прачытанае развіваюцца на ўроках мовы і літаратурнага чытання.

Другая задача – "навучыць дзяцей пісаць" – уключае навучанне тэхніцы пісьма, правапісу, выпрацоўку ўмення пісьмова выказваць свае думкі.

Трэцяя задача навучання роднай мове – "давесці да разумення самога ладу роднай мовы", як лічыць Я. Колас, вырашаецца граматыкай, якая павінна быць заснаванай на аналізе моўных з'яў [1, с. 325].

Чацвёртая задача – развіць іх вусную мову. Як вядома, вусная мова звязана з пісьмовай. Яна рыхтуе вучняў да авалодання навыкамі пісьмовай мовы. Адсюль – развіццё вуснай і пісьмовай мовы як працэс навучання, паводле Я. Коласа, павінен ісці разам: "развіццё вуснай і пісьмовай мовы злучаецца ў адно цэлае і ідзе поплеч" [1, с. 320].

Задачы, вызначаныя аўтарам першай беларускай методыкі, не страцілі сваёй каштоўнасці і сёння. Яны – вызначальны накірунак сутнаснай асновы новых школьных праграм па беларускай мове, у якіх не на словах, а ў сапраўднасці ўлічваецца тая акалічнасць, што родная мова з'яўляецца не толькі прадметам навучання, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання. Думкі, выказаныя Я. Коласам у свой час, знайшлі пацвярджэнне ў сучасных метадычных сістэмах. У прыватнасці, В. У. Протчанка і В. П. Протчанка разглядаюць працэс фарміравання агульнаадукацыйных навыкаў як выніковы ў адносінах да чытання, пісьма, уменняў лічыць, спяваць і карыстацца мовай як сродкам абмену думкамі, спосабам пазнання свету, інструментам уздзеяння на іншых людзей.

МГПУ им. И.П.Шамякина

З самага маленства, – падкрэсліваюць яны, – у дзіцяці "важна выхоўваць адносіны да слова як учынку, на аснове якога можна меркаваць аб маральных якасцях чалавека" [3, с. 8].

Сказанае – непасрэдная сувязь з коласаўскім бачаннем мэт выкладання роднай мовы, якое павінна быць скіравана на выпрацоўку ўменняў "сацыяльнага ўжывання мовы ў жывых адносінах дзяцей" [1, с. 323]. Менавіта тут, як і ў шмат якіх іншых месцах "Методыкі роднае мовы", трэба шукаць пачатак скіраванасці моўнай адукацыі на развіццё мовы, маўлення, мыслення і, як вынік, інтэлекту.

Мова, маўленне, мысленне і інтэлект – узаемазвязаныя паняцці, суцэльны ланцужок разумовай дзейнасці чалавека. Развіваць мысленне – значыць і развіваць мову вучняў, маўленне, інтэлект, а ў выніку – моўную асобу. Апошняе якраз і пакладзена ў аснову новых школьных праграм па беларускай мове. Гэта не што іншае, як творчае выкарыстанне коласаўскіх канцэптуальных падыходаў у навучанні роднай мове на сучасным этапе моўнай адукацыі вучняў.

Традыцыйны шлях навучання мове, які на працягу доўгага часу быў асноватворным у агульнаадукацыйнай школе, саступае месца асобаснаму. У цэнтры яго – вучань як індывідуальнасць, сфарміраваць якую трэба як моўна-грамадзянскую асобу, здольную да ўсвядомленага выкарыстання мовы ў якасці сродку зносін у грамадстве. Гэта адна з актуальных задач школьнай моўнай адукацыі. Маўленне, якое называе Я. Колас як "умелае актыўнае карыстанне роднай моваю" разглядаецца ў якасці канчатковай мэты навучання роднай мове, становіцца вызначальным у змесце і структуры школьнай моўнай адукацыі, пра што сведчаць сучасныя школьныя праграмы і падручнікі.

Коласаўская педагагічна-метадычная сістэма навучання вучняў шматгранная, усеабдымная. Яна – надзейная зарука нашых сённяшніх і будучых поспехаў у школьнай моўнай адукацыі. Пройдзе яшчэ шмат часу, а коласаўскія педагагічныя ідэі будуць успрымацца нашчадкамі як надзвычай важныя запаветы вялікага настаўніка.

Творча наследуючы коласаўскую канцэпцыю моўнай адукацыі вучняў, Л. П. Падгайскі, В. У. Протчанка, М. Г. Яленскі развілі яе далей і пашырылі да ўзроўню камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў навучанні роднай мове.

Пад камунікатыўна-дзейнасным падыходам у методыцы выкладання беларускай мовы ў школе мы разумеем такі змест і арганізацыю навучання, пры якіх у вучняў фарміруецца гуманістычнае па сваёй сутнасці этыка-маўленчае ядро як аснова развіцця іх камунікатыўна-дзейнасных здольнасцей, якія праяўляюцца ў сацыяльна абумоўленых моўна-маўленчых сувязях / узаемасувязях і паводзінах асобы як члена сям'і, члена дзіцячага калектыву і члена грамадства. Забяспечваецца такі

МГПУ им. И.П.Шамякина

падыход пры скіраванасці педагагічнага працэсу навучання мове на камунікатыўна-вербальную дзейнасць, прычым ва ўмовах, калі:

– камунікатыўная дзейнасць разглядаецца як скразная ідэя навучання;

– навучанне мове грунтуецца на псіхолага-педагагічных і дыдактыка-метадычных заканамернасцях яе засваення;

– педагагічная камунікатыўна-дзейнасная тэхналогія засноўваецца на арганічным спалучэнні мэтавага, матывацыйнага, зместавага, пааперацыйнага і ацэначнага кампанентаў.

Зместавую напоўненасць кожнага з кампанентаў камунікатыўна-дзейнаснага падыходу мы, у след за М. Г. Яленскім, які зрабіў гэта ў дачыненні да асобасна-арыентаванай педагагічнай тэхналогіі навучання роднай мове, прадстаўляем наступным чынам, лічачы камунікатыўна-дзейнасны падыход асаблівай разнавіднасцю асобаснага падыходу:

*мэтавы кампанент* – моўная асоба вучня: індывідуальнае этыка-маўленчае камунікатыўнае ядро;

*матывацыйны кампанент* – пазнавальна-практычныя намеры;

*зместавы кампанент* – моўныя і маўленчыя камунікатыўныя здольнасці індывіда; *пааперацыйны кампанент* – суразмоўніцтвы "настаўнік ↔ вучань", "вучань ↔ настаўнік", "настаўнік ↔ вучні", "вучні ↔ настаўнік", "вучань ↔ вучань", "вучні ↔ вучань", "настаўнік ↔ мікрагрупа вучняў", "мікрагрупа вучняў ↔ настаўнік"; іншыя віды асобасна-камунікатыўнай дзейнасці (аўдзіраванне, гаварэнне, чытанне і пісьмо) і дыдактыка-метадычныя прыёмы іх рэалізацыі (інсцэніроўка і драматызацыя твора, стварэнне ўласнага твора на ўзор прачытанага, напісанне розных паводле жанру тэкстаў-апавяданняў, тэкстаў-апісанняў, тэкстаў-разважанняў, удзел у дыялогах, палілогах і інш.);

*ацэначны кампанент* – рэфлексія.

Скіраванасць педагагічнага працэсу моўнай адукацыі на станаўленне і развіццё моўнай асобы вучняў, яго індывідуальнага этыка-маўленчага камунікатыўнага ядра – адна з актуальных задач навучання роднай мове ў агульнаадукацыйнай школе, пачынаючы з пачатковых класаў. Яна паспяхова можа быць рэалізавана пры ўмове, калі настаўнік творча авалодае коласаўскай канцэпцыяй моўнай адукацыі вучняў, калі ўсе сродкі навучання (падручнікі і навучальна-метадычныя комплексы, наглядныя і тэхнічныя сродкі навучання) будуць падпарадкаваны скразной ідэі асобаснага моўна-маўленчага развіцця школьніка, калі навучальны працэс будзе нацэлены на авалоданне мовай як знакавай сістэмай і сродкам зносін у грамадстве.

**Літаратура**

1. Колас, Я. Методыка роднае мовы / Я. Колас // Збор твораў у 14 т. – Мінск: Маст. літ., 1976. – Т 12. – 532 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Піскун, Я. У. Коласаўская канцэпцыя моўнай адукацыі вучняў пачатковых класаў / Я. У. Піскун // Каласавіны: матэрыялы навук. канф. – Мінск: Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, 1998. – С. 144–146.

3. Протчанка, В. У., Протчанка, В. П. Адукацыя, школа і нацыянальная культура / В. У. Протчанка, В. П. Протчанка // Пачатковая школа. – 1993. – № 1. – С. 7–10.

МГПУ им. И.П.Шамякина